Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень рускімі і лацінскімі літэрамі.**

Адрэс рэдакціі і адміністрації: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За границай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес —2 р., 3 мес. —1 р. Перамена адрэсу — 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. залінейу малымі літэрамі. Рукапісы і карэспадэнції, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праудзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдаціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VII. 5 (18) студня (января) 1912 г. № 1.

## „НАША НІВА“

**Гэта люстро душы, думак і патрэб Беларусі.**

У 1912 гаду усім гадавым і поўгадавым падпішчыкам Рэдакція разашле, як безплатны прыдатак, **„Беларускі Календар“ на 1912 год**, а у працягу году падпішчыкам разашлецца ешчэ колькі іншых цікавых і карыстных кніжак. Цэна с перэсылкай да хаты: на 1 год - 2 р. 50 к., на 6 м. —1 р. 25 к., на 3 м.—65 к., на 1 м.—25 к. За граніцай: на 1 год—4 р.,на 6 м.—2 р., на 3 м. 1 р.

**Усе каму дарага і блізка справа жыцьця і адраджэньня Беларусі і беларусоў, выпісывайце, чытайце і шырце беларускую газэту „НАШУ НІВУ“.**

## 1812—1912.

Гэты Новы—1912—Год многа успаміноў прыносіць з сабою. У нас ешчэ жыве памяць аб тым, „як французская сіла і з-за Нёмна наступіла“, як аграмаднае войско Наполеона, зложэнае з дванадцаці націй, праходзіло праз наш край, кіруючыся на Маскву, а посьле—вертаючыся—крок за крокам адступалося пад націскам расейцоў. Было гэта роўна сто гадоў таму назад...

Кожная вайна—гэта вялікае нешчасьце як для націй, каторые між сабой ваююць, так і для тэй старонкі, у якой вайна йдзе. Многа бяды і гора прынесла з сабой нашаму краю і вайна с французамі. Гэта-ж тые сотні тысяч людзей, каторые грамадамі праходзілі праз нашы вёскі і гарады, павінны былі у нас пракарміцца, і знайсьці тутака пажыву і для сябе, і для сваіх каней і т. д. Пасьля кожнаго пераходу войска пусьцелі сьвірны і хлявы вясковые, пусьцелі і вёскі, а ў хатах селянскіх доўга чутны былі нарэканьня і плач.

Многа благога спазнаў тады наш народ. Здавалося, што ўся гісторыя яго павінна павярнуцьца зусім у другі бок; то ізноў у адзін дзень усё новае зменялося на даўнейшы лад. Ня гледзячы на гэта, мы як жылі, так і асталіся жыць. Сьвежые магілы пазарасталі травой; у клеці і сьвірне новае дабро завялося; аб старых крыўдах папамяць аслабела... І ўся тая буранавальніца, што праляцела над нашай старонкай, што—здавалося—магла ўсё жыцьцё наше перэвярнуць уверх дном, пакінула сьлед адно ў казках-гутарках старых людзей, у песьнях ды вершах народных.

Гэта—ня дзіва: хто знае гісторыю розных народоў, той ведае, што яна ня робіцца ў адзін дзень. Жыцьцё ня можэ зразу крута звярнуць з сваей дарогі: сотні прычын кіруюць яго ў той, ці іншы бок, дарогу яму вызначаюць сталецьця, і ня гледзячы на тые буры, што ненацкам налетаюць, жыцьцё—гэтае шэрае, штодзеннае жыцьцё цячэ далей так сама, як і перш цякло. З дробных цеглін складаецца вялікая будоўля гісторыі народоў і гасударств, і толькі такая будоўля гмах бывае моцная.

1812—1912, Стаўляючы побоч гэтые два гады родзіцца думка-пытаньне: ці гэты новы год ня суліць нам ізноў тэй навальніцы, што разбушэвалася сто лет таму назад над ўсей Эўропай, закранула ўсе націі?—„Цяжкіе, чорные хмары сабраліся над Эўропай—кажэ быўшы французскі міністэр, Пішон.—Добра будзе, калі з іх выйдзе толькі якая невялікая вайна“.

Пасьля вялікіх войн часта перэменяюцца граніцы гасударств, часта адна дзержава захоплівае чужые землі і т. п. Але цэльные народы, што на тых землях жывуць, ад гэтаго йшчэ ня гінуць: толькі доля іх часам зменяецца. Народы гінуць не ад навальніц, а тады, калі ў іх німа ўжо жывой сілы—таго клёку, што з зерняці выганяе расьліну,—гінуць ад унутрэнаго развалу.—Гэта павінны памятаць усе, павінны ведаць і мы, беларусы. Нашы сілы йшчэ ня дужа вялікіе: мы восьвось толькі прабудзіліся, пачалі пазнаваць, хто мы такіе, прыступілі да работы дзеля збудаваньня новаго жыцьця. Мы йшчэ так нідаўна сталі развіваць тое, ў чым сіла і моц кожнай націі: сваю національную культуру. Мы йшчэ не зусім уцямілі, што, ня гледзячы на ўселякіе раздзелы, спорні і сваркі, ўсе беларусы—гэта родные браты, гэта адна сем'я,—што 9—мільённая грамада раскінутых на вялізным абшары беларусоў—гэта адзін суцэльны народ.

Унутрэная культурная сіла, моцная національная сьведамасць—вось аружжэ, каторым мы зможэм бараніцца ад тых нягод, якіе мо' нясе нам будучына. І цяпер, калі страх перад вялікай вайной не дае спаць діпломатам усіх дзержаў, мы свае сілы павінны аддаваць на тое, каб гэткае аружжэ выкаваць. Да такой работы с пачаткам Новаго году клічэм усіх, каму на сэрцы ляжыць доля беларускаго народу.

## З заграніцы.

Расейскае войско, каторае было паслана ў Пэрсію дзеля абароны расейскіх падданых, спаўняе сваю задачу. У Таврызе па прыгавору ваенна-палевога суда павешэны колькі людзей, каторых вінавацілі ў тым, што яны нападалі на рускіх. Салдаты ўзарвалі дынамітам 4 дамы пэрсоў, с каторых нехта стрэляў ў расейскае войско. Гэтак думаюць прымусіць пэрсоў шанаваць рускіх і Расею. Але бадай што такі спосаб карысьці нікому ня дасць: як паведамляюць газэты, у пэрсідзкіх бажніцах расклеены пракламаціі, каторые клічуць усіх пэрсоў да паўстаньня проці расейцоў.

Ужэ з гэтаго відаць, што справы Расеі ў Пэрсіі ідуць ня лішне гладка. „Нов. Вр.“ ужо даўно даводзіць, што Расея павінна была забраць пад сваю руку тую часць Пэрсіі, каторая бліжэй да Расейскай граніцы (—паўночную), а тады Англія умацавалася бы у палудзеннай часьці, што сумежна з Індіей. Але цяпер ёсць ешчэ і трэйці ахвотнік да Пэрсідзкай зямлі: гэта—туркі. Апошнімі часамі яны памаленку, крок за крокам залезалі ў Заходнюю часць Пэрсіі, а цяпер, калі аб раздзелі Пэрсіі гукаюць зусім аткрыта, Турція маніцца з гэтаго скарыстаць. Здаецца, што з Італіей туркі скора зробяць згоду, а калі ім і прыдзецца адрэчыся ад Трыполіса, дык думаюць пакрыць страту сваю часткай Пэрсіі.

Ведама, пры гэткай дзялідзьбе без сваркі не абойдзецца. Раздуць жэ гэту сварку парупяцца другіе дзержавы. На першым пляне тут стаіць Немеччына і яе хаўрусніца Аўстрыя. Ешчэ нідаўна аўстрыйскі наследнік рыхтаваўся да вайны з Італіей; цяпер шмат кажуць аб вайне з Расеей, проці каторай наследнік нічога ні мае і каторую прарочаць, як толькі памрэ цяперашні аўстрыйскі імператар, ужо надта стары—Франц Іозэф.

Для вайны патрэбны заўсягды грошы. Бяз іх—нічога ня зробіш. І Аўстрыя ўжо даўно рупіцца аб тое, каб пазычыць грошы у Франціі. Але Англія, каторая цяпер с французамі жыве ў хаўрусе, сказала французскаму правіцельству, каб аўстрыякам грошы не даваць. Дык тут ізноў немцы скоса паглядаюць на Англію, хаця немецкі імператар і заверае, бытцым ён вялікі прыяцель Англіі.

Адным словам, усе ўсімі нездаволены. І досі аднэй іскры, каб разгарэлася вялікая эўропэйская вайна. Вось тэй іскры ўсе і чэкаюць. Ці дасць яе Пэрсія, ці Балканскіе гасударствы, ці мо' заляціць яна ажно с Кітаю,—нет ведама. А ў Кітаі палажэньне дужа цікавае: там цяпер ёсць два урады—дзьве ўласьці. Адна часць аграмаднаго гасударства ужо аб'явіла сябе рэспублікай і выбрала сабе прэзыдэнта—доктара Сун-Ят-Сана; другая йшчэ падуластна старому богдыхану. Між абодвымі правіцельствамі ідзе змаганьне, ідзе вайна, але ўжо блізка напэўна можна сказаць, што рэволюціонеры перэважываюць. Часць жэ Кітаю—правінція Монголія—зусім аддзялілася ад рэшты гасударства і выбрала сабе свайго богдыхана. Вось, расейскі урад, каторы здаўна паддзержываў расейскі гандэль у Монголіі, стараецца умацаваць сваю сілу ў новай дзержаве, а на гэта ізноў ні надта ахвотна прыстане Кітай і іншые эўропэйскіе гасударствы, дый Амэрыка і Японія. І з гэтаго боку так сама нет ведама, што прынясе 1912 год.

**Г. Б.**

## Голад у Велікаросіі.

Карэспандэнт газэты „Рѣчь“ Кондурушкін ездзіць цяпер па галодных губэрнях і прыгледаецца да тэй бяды, якую цярпіць велікарус мужык. Ён думае, што гасударство павінна мацней памагаць, чым хто цяпер памагае у вялікай народнай бядзе. На першы погляд у вёсцы не відаць голада, людзі працуюць, ходзяць у госьці, у цэркву, а калі праедзеш колькі сот вёсак, ды ешчэ закінутых і далёкіх, то знайдзеш, людзей каторым ужо німа чаго есьці і яны хвареюць і паміраюць ад нехвата харчоў. Свой хлеб маюць ня больш як 10 хат с сотні, а другіе купляюць хлеб, а каб купіць трэба мець грошы, а каб дабыць грошы, мужыкі: расейскіе, башкіры, немцы, казакі, „разночынцы“ павінны прадаваць каней, кароў, авец, нават платы, збрую, адзежу. А апошніе часы, нават *зямлю*, а без зямлі мужык ужо не мужык. Скаціна пачала зводзіцца ужо летам ад сушы. У сяле Кочэрдыку Чэлябінскаго павету сталі дохнуць з голаду коні, каровы. Калі карові распарывалі бруха, то знахадзілі ад 5 да 17 фунтаў чыстай зямлі

Цэна на скаціну малая: у 5, 10 нават 20 разоў меншая, як заўсягды; конь ад 4 руб. да 15 руб.; дойная карова ад 7 руб. да 20 руб. Трэйцюю часць скаціны ужо прадалі, а да вясны ешчэ прадасьца і здохне шмат.

С чым вясной хлебароб зачне гаспадарку? Ідуць весткі з усіх губэрняў галодных, што шмат участкаў зямлі векавечные землязробы прадаюць, ні маючы чаго есці. Напрыклад у с. Моршы Нікал. пав. Самарск. губ. 63 хаты прадалі 57 надзелоў па 8 дзесяцін, кожын надзел за 150 рублёў. Гэтые кавалкі зямлі, што яны адрэзалі ад сваіх шнуроў да вясны з'ядуць. 10 хат прадалі усю зямлю да чыста. Ды апроч таго 18 надзелоў аддадзены у застаў.

— „Сягоньня ешчэ з 10 прададуць, казалі мужыкі з жалем; сабраўшыся грамадай каля воласьці у с. Маршы—„паміраць ніхто ня хочэ!“

Купляюць багатые мужыкі. Па другіх вёсках у адным велікарускім сяле багаты сельскі мужык, маючы краму і поўные клеці дабра, а значыць, захапіўшы слабейшых мужыкоў у „кулак“, скупіў каля 1000 дзес. зямлі.

## З Новым Годам.

З Новым Годам весяліся,
Беларускі люд!
З Новым Годам пашырыся,
Грамадзянскі труд!
З Новым Годам закрасуйся
Шчасна, наш народзе,—
Ліха-ж, гора адступіся
Ў гэтым Новым Годзе!
З Новым Годам мілай госьцяй
Проста, як на дзіва,
Ў кожнай хаці і ў палацы
Будзь ты, Наша Ніва!
З Новым Годам працьвітай Ты,
Беларусь сьвятая;
З Новым Годам нас спаткай ты,
Доля удалая...
З Новым Годам, грамадзяне,
Многа сіл вазьміце,
Нашу мову, нашу песьню
Між людзьмі шырыце!...

**Броніслава Свідэрская.**

## Атказ на новагодніе „павіншаваньня“.

Усім ведама, што беларусы ніколі не нападалі і не нападаюць на другіе націі: яны ўсіх роўна шануюць, ня гледзячы на тое, ці

